Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by



УДК 027.1(476)Глебка:[097:027(474.5-25)]

# Выданні са штампамі віленскіх кнігазбораў у асабістай бібліятэцы Пятра Глебкі

***Свёкла Віктар Віктаравіч***,
*навуковы супрацоўнік*
*Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа*
*Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі*

***Аннотация:*** *Разглядаюцца выданні з асабістай бібліятэкі пісьменніка і навукоўца П.Ф. Глебкі (захоўваецца ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Я. Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі), якія раней належалі ўстановам і арганізацыям Вільні 1920–1930-х гг., а таксама віленскаму грамадскаму і рэлігійнаму дзеячу Адаму Станкевічу. Робіцца спроба даследавання гісторыі паступлення гэтых выданняў у бібліятэку П.Ф. Глебкі.*

***Ключевые слова:*** *П.Ф. Глебка, асабістая бібліятэка П.Ф. Глебкі, Вільня, кнігазборы Вільні, А. Станкевіч, кнігазбор А. Станкевіча.*

Асабістая бібліятэка беларускага пісьменніка і вучонага Пятра Фёдаравіча Глебкі (1905–1969), якая захоўваецца ў аддзеле рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (ЦНБ НАН Беларусі), – адзін з найбольш багатых і каштоўных прыватных кнігазбораў свайго часу ў Беларусі. Былы ўладальнік пачаў фарміраваць яго яшчэ ў маладосці і працягваў гэта рабіць да апошніх дзён жыцця.

У выдадзены ў 2015 г. каталог «Бібліятэка акадэміка П.Ф. Глебкі» [1] уключаны паказальнік штампаў і ярлыкоў, размешчанных на кнігах з асабістай бібліятэкі вучонага. Гэты паказальнік дае зразумець, што ў кнігазборы П.Ф. Глебкі нямала выданняў, якія ў розны час належалі ўстановам, арганізацыям і прыватным асобам з розных краін.

Траплялі ў бібліятэку пісьменніка і кнігі, месцам знаходжання якіх пэўны час была Вільня. Каталог кнігазбору П.Ф.Глебкі дазволіў выявіць выданні з наступнымі штампамі віленскіх устаноў (у дужках – колькасць кніг з бібліятэкі П.Ф. Глебкі, пазначаных адпаведным штампам):

- «Беларускі музей ім. Івана Луцкевіча» (1);
- «Беларускі студэнцкі саюз у Вільні» (6);
- «Бібліатэка 1-ае Віленскае беларускае гімназіі» (6);
- «Бібліятэка Беларускага навуковага Таварыства» ў Вільні» (4);

Редкие коллекции библиотек: опыт сохранения и популяризация, РНТБ, 2022



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by


- «Бібліятэка БСС у Вільні» (6);
- «Bibljoteka I.N. B.E.W» (1);
- «Wileński związek Teatrów i Chorów Ludowych» (1).

Акрамя таго, П.Ф. Глебка захоўваў у асабістай бібліятэцы 26 асобнікаў, якія ў свой час уваходзілі ў склад буйнога прыватнага віленскага кнігазбору. Яны пазначаны штампам «Кнігазбор Кс. Адама Станкевіча» і былі ўласнасцю рэлігійнага, грамадскага і культурнага, дзеяча Заходняй Беларусі Адама Станкевіча (1892–1949).

Пры дапамозе пералічаных штампаў няцяжка вызначыць арганізацыю, якой належалі пазначаныя імі кнігі. Так, штампы «Беларускі студэнцкі саюз у Вільні» і «Бібліятэка БСС у Вільні» выкарыстоўваў Беларускі студэнцкі саюз – арганізацыя студэнтаў-беларусаў Універсітэта Стэфана Баторыя ў Вільні, якая існавала з 1920 да 1939 г. [2]. Аб тым, што гэта штампы адной і той жа ўстановы, кажа тое, што яны паралельна сустракаюцца на тых самых кнігах.

Штампы «Бібліятэка Беларускага навуковага Таварыства» ў Вільні» і «Беларускі музей ім. Івана Луцкевіча» варта разглядаць у агульным кантэксце ў сувязі з тым, што абедзве арганізацыі, якія імі карысталіся, існавалі пры Беларускім навуковым таварыстве (БНТ) ў Вільні, якое дзейнічала ў 1918–1939 гг. і мела на мэце «рознабаковую навуковую працу, развіццё любові да навуковых доследаў і пашырэнне ведаў» [3]. Пры БНТ існавалі Беларускі гісторыка-этнаграфічны музей, у аснову якога была пакладзена прыватная калекцыя беларускага этнографа і археолага Івана Луцкевіча, а таксама бібліятэка, заснаваная на базе прыватнай калекцыі Барыса Даніловіча.

Кнігі са штампамі «Бібліатэка 1-ае Віленскае беларускае гімназіі» належалі аднайменнай установе – адной з першых беларускіх сярэдніх школ Заходняй Беларусі. Гімназія была заснавана ў Вільні ў 1919 г. па ініцыятыве І. Луцкевіча і існавала да 1944 г. [4].

Штамп «Wileński związek Teatrów i Chorów Ludowych» выкарыстоўвала арганізацыя, назва якой перакладаецца як «Саюз народных тэатраў і хораў». Саюз народных тэатраў быў заснаваны ў 1919 годзе ў Варшаве з мэтай развіцця і аб’яднання аматарскага тэатральнага руху ў Польшчы [5]. Аддзяленні гэтай арганізацыі пад ідэнтычнымі або крыху адрознымі назвамі існавалі і ў іншых рэгіёнах Польшчы, у тым ліку і на заходнебеларускіх і заходнеўкраінскіх землях, уключаных у яе склад. Віленскі саюз народных тэатраў і і хораў сваю існаванне, відаць, спыніў неўзабаве пасля пачатку Другой сусветнай вайны.

Штампам «Bibljoteka I.N. B.E.W», вельмі верагодна, карысталася бібліятэка Навукова-даследчага інстытута Усходняй Еўропы (польск. Instytut Naukowo-Badawczy Europy Wschodniej) – цэнтра даследаванняў усходніх тэрыторый Другой Рэчы Паспалітай і савета лагічных даследаванняў, які дзейнічаў у Вільні ў 1930–1939 гг. пры ўніверсітэце Стэфана Баторыя[6].


Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by





«Віленскія» кнігі з бібліятэкі П.Ф. Глебкі выдаваліся у храналагічным прамежку з 1857 па 1941 г. Тэматыка іх разнастайная, але перш за ўсё гэта мастацкая літаратура і кнігі па гуманітарных навуках, што цалкам адпавядае чытацкім інтарэсам П.Ф. Глебкі.

Большасць гэтых кніг – выданні 1920–1940 гг., якія з'яўляюцца прадукцыяй мясцовых выдавецтваў (выдавецтва Б.Клецкіна, выдавецтва газеты «Воля народу», выдавецтва У. Знамяроўскага і інш.) пераважна на беларускай мове: п'есы Ф. Аляхновіча «Шчаслівы муж» (1922) і «Дзядзька Якуб» (1928), «Абарона зямлі» У. Рэйманта (1929), «Беларусь» Л. Родзевіча (1922), «Апавяданні аб жывёлах» Ю. Вагнера (1923) у перакладзе з рускай мовы Я. Пачопкі.

Радзей сустракаюцца беларускамоўныя выданні ранейшага часу, што выходзілі ў іншых гарадах: напрыклад, надрукавапныя ў Санкт-Пецярбургу «Вязанка» Я. Лучыны» (1903) або кніга Г. Бярозкі «Пчаліна – жывёла малая, а карысці дае многа» (1911). Бадай, найбольш рарытэтнае з такіх выданняў –«Dudarz Białoruski, czyli wszystkiego potrosze» («Дудар Беларускі, або ўсяго патроху») В. Дуніна-Марцінкевіча (Мінск, 1857).

Яшчэ больш рэдкія рускамоўныя і польскамоўныя кнігі, а таксама выданні на іншых мовах. Кніг, выдадзеных у БССР і ўвогуле ў СССР, няма зусім.

Што датычыцца выданняў з кнігазбору А. Станкевіча, то нават той невялікі вынятак з яго, які стаў уласнасцю П. Глебкі, сведчыць аб тым, што айцец Адам быў дасведчаным бібліяфілам з немалым стажам. Віленскіх выданняў часоў Другой Рэчы Паспалітай у яго бібліятэцы таксама было нямала, але ён валодаў і больш раннімі, часам надвычай рэдкімі выданнямі, нарукаванымі ў Маскве, Санкт-Пецярбургу, Варшаве і іншых гарадах. Ад А. Станкевіча да П.Ф. Глебкі перайшло нямала кніг па філалогіі: «Русская литература от семидесятых годов до наших дней» Р. Іванова-Разумніка (1923), якая выйшла ў рускім мігранцкім выдавецтве «Скифы» ў Берліне, лінгвістычныя працы Я.Ф. Карскага, А.К. Сержпутоўскага, А.А. Шахматава, лексікаграфічныя выданні «Русско-литовский словарь» (складальнік С.Я. Розен, 1941), «Słownik staropolski» (1914) А. Краснавольскага і У. Нядзведскага і інш. Сярод іншага – выданні па гісторыі, мастацтвазнаўстве, філасофіі (пераважна польскамоўныя), а таксама перыядычнае выданне «Litwa» за 1908–1914 гг, якое выходзіла ў Вільні пад рэдакцыяй М. Давойны-Сільвястровіча.

Выклікае цікавасць пытанне, калі і якім чынам пералічаныя выданні сталі ўласнасцю П.Ф. Глебкі. Амаль усе згаданыя установы і арганізацыі спынілі сваю дзейнасць у 1939 г., пасля нападзення фашысцкай Германіі на Польшчу (Віленская беларуская гімназія – на 5 гадоў пазней).  У 1949 г. перастаў быць уладальнікам свайго кнігазбору і А. Станкевіч, які па абвінавачванні ў антысавецкай дзейнасці быў асуджаны на 25 гадоў пазбаўлення волі і памёр ў канцы гэтага ж года.

Малаверагодна, што П.Ф. Глебка мог папоўніць сваю бібліятэку выданнямі з віленскіх кнігазбораў раней, як у пасляваенны час. Але дакладна акрэсліць час



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by


іх набыцця праблематычна, за выключэннем адной кнігі –згаданага «Дудара Беларускага…» В. Дуніна-Марцінкевіча, на якім побач з уладальніцкім запісам П.Ф. Глебкі ёсць і дата – 27 кастрычніка 1947 года.

Які ж лёс быў у гэтых кніг пасля таго, як не стала іх віленскіх уладальнікаў?

Нам невядомыя даследаванні і публікацыі, якія б датычыліся бібліятэк Беларускага студэнцкага саюза у Вільні і Віленскай беларускай гімназіі, а таксама кнігазбораў згаданых польскіх арганізацый. Што датычыцца лёсу кніг з прыватнай бібліятэкі А. Станкевіча, а таксама экспанатаў музея імя І. Луцкевіча, то пэўны інтарэс у даследчыкаў яны выклікалі.

Так, шляхі кніг з асабістай бібліятэкі А. Станкевіча прасочваюцца ў артыкулах Г.В. Кажамякіна [7] і І.Л. Мурашовай [8]. З апошняй публікацыі можна даведацца, што святар у 1944 г., пасля арышту савецкай ўладай, склаў завяшчанне, згодна з якім кнігі пасля яго смерці адыходзілі ва ўласнасць яго пакаёўцы Марыі Шутовіч. У другой палове 1960-х гг. М. Шутовіч прадала 276 кніг, якія раней належалі ксяндзу, ЦНБ НАН Беларусі. Захаваўся і спіс, згодна з якім ажыццяўляўся продаж [9].

Аднак бясспрэчна, што кнігі А. Станкевіча, якімі валодаў П.Глебка, былі страчаны святаром значна раней. Гэта магло адбыцца яшчэ да 1939 г.: у друку ёсць згадкі пра вобыскі і канфіскацыі кніг на кватэры святара, якія неаднаразова рабілі не толькі савецкія, але і польскія ўлады [10, с. 838] [11, с. 14]. Аднак інфармацыя пра лёс канфіскаваных выданняў адсутнічае.

Што датычыцца гісторыі экспанатаў музея імя І. Луцкевіча пасля яго ліквідацыі, то яна досыць падрабязна разледжана, напрыклад, у інтэрнэт-публікацыі Сяргея Крапівіна. [12]. Паводле яе, перавезеныя яшчэ ў канцы вайны ў Мінск каштоўнасці да заснавання ў 1957 г. Беларускага дзяржаўнага гісторыка-краязнаўчага музея (зараз – Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь) знаходзіліся ў службовых памяшканнях Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны без належнага ўліку і інвентаызацыі. Гэта магло спрыяць знікненню прадметаў музейнай каштоўнасці са складскіх памяшканняў і з'яўленню іх у прыватных калекцыях. Гіпатэтычна мог стаць уласнікам некаторых з іх і П.Ф. Глебка, тым больш што ён меў асабістыя знаёмствы з куратарамі працэсу перадачы музейных каштоўнасцей з Вільнюса ў Мінск (у прыватнасці, з сакратаром ЦК КПБ па ідэалогіі Ц.С. Гарбуновым і намеснікам загадчыка аддзела прапаганды ЦК КПБ І.С. Краўчанкам), але доказаў гэтага няма.

Сведчанне дырэктара Беларускага музея ў Вільні ў 1941–1944 гг. Янкі Шутовіча аб тым, што айцец А. Станкевіч падчас наступлення савецкіх войск на Вільнюс у 1944 г. зберагаў найбольш каштоўныя экспанаты музея ад знішчэння ў склепах віленскага касцёла святога Міхаіла [13, арк. 66], дазваляе зрабіць дапушчэнне, што кнігі з бібліятэк А. Станкевіча і музея імя І. Луцкевіча яшчэ у віленскі перыяд маглі перамяшацца ў складзе аднаго кнігазбору. Аднак гэтая


Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by





гіпотэза мае некалькі хібаў. Па-першае, Я. Шутовіч сцвярджае, што пасля ўваходу ў Вільнюс савецкіх войск скрыні, што захоўваліся ў касцёле св. Міхаіла, «не былі ўскрыты, […], пры гэтым нічога са скрынь не ўзята, усе экспанаты былі ў поўнай захаванасці» [13, арк. 66]. Гэта дае падставу думаць, што А. Станкевіч цалкам вярнуў у музей экспанаты, якія часова захоўваў. Такім чынам, з'яўленне ў бібліятэцы П. Глебкі кніг, якія раней належалі Беларускаму музею імя І. Луцкевіча, і выданняў з кнігазбору А. Станкевіча, хутчэй за ўсё, не маюць сувязі. Па-другое, няма выпадкаў наяўнасці штампаў бібліятэкі А. Станкевіча і бібліятэкі музея імя І. Луцкевіча на адной і той жа кнізе.

Дарэчы, прыкметы таго, што некаторыя са згаданых тут кніг мянялі ўладальніка яшчэ да таго, як трапілі ў глебкаўскую бібліятэку (экслібрысы, уладальніцкія запісы і інш.), існуюць. Так, сярод папярэдніх (або пазнейшых) уладальнікаў выданняў з кнігазбору А. Станкевіча былі як некаторыя са згаданых у дадзеным артыкуле ўстаноў і арганізацый, так і вядомыя постаці гісторыі Беларусі: Мар'ян Пецюкевіч, Рамуальд Зямкевіч, Міхал Пятроўскі. А ўсё той жа «Дудар Беларускі…» В.Дуніна-Марцінкевіча належаў не толькі бібліятэцы БНТ, але і Вацлаву Ластоўскаму, і Ігнату Дварчаніну. Такія міграцыі кніг у перспектыве вартыя асобнага даследавання. Далёка не вычарпаная і тэма лёсу разгледжаных у дадзеным артыкуле віленскіх кнігазбораў, а таксама гісторыі паступлення кніг з іх у бібліятэку П.Ф. Глебкі. Далейшыя даследаванні ў гэтым кірунку, у першую чаргу з выкарыстаннем архіўных дакументаў, магчыма, яшчэ установяць невядомыя зараз факты і зменшаць колькасць загадак і белых плямаў, якіх пакуль застаецца вельмі шмат.

*Спіс выкарыстаных крыніц*

1. Бібліятэка акадэміка П. Ф. Глебкі (1905–1969) : кат. выд. : з фонду аддз. рэд. кніг і рукап. Цэнтр. навук. б-кі імя Я. Коласа Нац. акад. навук Беларусі / Нац. акад. навук Беларусі, Цэнтр. навук. б-ка імя Я. Коласа ; [склад.: А. В. Сцефановіч (адказ. склад.) і інш. ; рэд. бібліягр. зап.: І. Л. Мурашова, А. У. Траццякова ; рэдкал.: А. І. Груша (гал. рэд.) [і інш.] ; прадм.: І. Л. Мурашова, В. А. Губанава]. – Мінск : Беларус. навука, 2015. – 421, [2] с., [62] с. фат. : іл.
2. Бабкін, Г. В. Беларускі студэнцкі саюз / Г. В. Бабкін // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / Беларус. Энцыкл. ; рэдкал.: М. В. Біч [і інш.] ; прадм. М. Ткачова]. – Мінск, 1993. – Т. 1 : А – Беліца. – С. 453.
3. Ліс, А. С. Беларускае навуковае таварыства / А. С. Ліс // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / Беларус. Энцыкл. ; рэдкал.: М. В. Біч [і інш.] ; прадм. М. Ткачова]. – Мінск, 1993. – Т. 1 : А – Беліца. – С. 455.
4. Луцкевіч, Л. А. Віленская беларуская гімназія / Л. А. Луцкевіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / Беларус. Энцыкл. ; рэдкал.: Б.



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by



І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.] – Мінск, 1994. – Т. 2 : Беліцк – Гімн. – С. 279–281.

5. Związek Teatrów Ludowych [Electronic resource] // Encyklopedia PWN. – Режим доступа: https://encyklopedia.pwn.pl/haslo/Zwiazek-Teatrow-Ludowych;4002460.html. – Дата доступа: 19.09.2022.
6. Instytut Naukowo-Badawczy Europy Wschodniej [Electronic resource] // Wikipedia. – Режим доступа: https://pl.wikipedia.org/wiki/Instytut_Naukowo-Badawczy_Europy_Wschodniej. – Дата доступа: 19.09.2022.
7. Кажамякін, Г. В. Лёс кнігазбору Адама Станкевіча / Г. В. Кажамякін // Матэрыялы XI Міжнародных кнігазнаўчых чытанняў «Кніжная культура Беларусі XI – пачатку XX ст.», Мінск, 16–17 красавіка 2015 г. / [склад.: Г. У. Кірэева, Т. А. Сапега, А. А. Суша ; рэдкал.: Р. С. Матульскі (старш.) і інш.]. – Мінск, 2015. – С. 263–269.
8. Мурашова, І. Л. Кнігазбор Адама Станкевіча ў фондзе Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я. Коласа Нацыянальнай акалдэміі навук Беларусі / І. Л. Мурашова // Матэрыялы XIV Міжнародных кнігазнаўчых чытанняў, прымеркаваных да 400-годдзя першага «Буквара», Мінск, 26–27 красавіка 2018 г. / [склад.: Т. А. Сапега, А. А. Суша ; рэдкал.: Р. С. Матульскі (старш.) і інш.]. – Мінск, 2018. – С. 241–246.
9. ЦНБ НАН Беларусі, аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў. – Ф. 4. Воп. 1. Адз. зах. 50.
10. Станкевіч, А. З Богам да Беларусі : зб. тв. / А. Станкевіч ; уклад., навук. рэд.., камэнт. і прадм. А. Пашкевіч, А. Вашкевіч. – Вільня : Ін-т беларусістыкі, 2008. – 1097 с. : ил., цв. ил., портр., факс.
11. Вашкевіч, А. Адам Станкевіч: арышт і смерць / А. Вашкевіч // Homo historicus, 2009 : гадавік антрапалаг. гісторыі / Ін-т гіст. даслед. Беларусі ; пад рэд. А. Ф. Смаленчука. – Вільня : ЕГУ, 2010. – 397 с. : іл.
12. Крапивин, С. Беларусь–1945. Музей Ивана Луцкевича в Вильно и его переезд на минский склад [Электронны рэсурс] / С. Крапивин. – Режим доступа: https://naviny.by/rubrics/society/2010/02/01/ic_articles_116_166455/. – Дата доступа: 19.09.2022.
13. ЦНБ НАН Беларусі, аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў – Ф. 1. Воп. 1. Адз. зах. 60.



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by